**УДК 1(476)(091)+141.30**

# НЕТАМІСТЫЧНЫ АСПЕКТ ГНАСЕАЛАГІЧНАЙ ПРАБЛЕМАТЫКІ БЕЛАРУСКАЙ РЭЛІГІЙНА-ФІЛАСОФСКАЙ ДУМКІ ХХ стст.

***Г.І. КЛІМОВІЧ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца феномен рэцэпцыі праграмных установак неатамізму ў гнасеалагічным аспекце беларускай рэлігійна-філасофскай думкі ХХ ст. Гнасеалагічная праблематыка была адной з найбольш актуальных на працягу ўсіх этапаў развіцця напрамку тамізму. Таксама яна працягнула заставацца ў цэнтры ўвагі і ў прадстаўнікоў філасофіі неатамізму. Даецца адказ на пытанне: якія канцэпты дадзенай плыні аказалі ўплыў на фармаванне беларускай рэлігійна-філасофскай думкі каталіцкай плыні, якія былі асаблівасці іх успрыняцця, а таксама ці варта лічыць творчасць беларускіх прадстаўнікоў неатамістычнай у сваім змесце.*

**Уводзіны**. Мэта дадзенага артыкулу – вызначыць асноўныя катэгорыі неатамізму, прысутныя ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы каталіцкага накірунку ў ХХ ст., а таксама прасачыць асаблівасці іх успрыняцця ў мясцовай традыцыі.

Трэба адзначыць, што ад самага пачатку ўзнікнення тамізму, ужо ў творах Фамы Аквінскага, відавочная глыбокая засяроджанасць менавіта на гнасеалагічнай тэматыцы. Разам з анталагічнай яна становіцца асноватворным аспектам філасофскай дактрыны тамізму; на ўсіх этапах яе развіцця яна з'яўляецца адной з найбольш актуальных і дыскусійных. Да спецыфічнай рысы неатамісцкай гнаселогіі трэба аднесці засяроджанасць на пытанні ўзаемаадносін веры і розуму. Яе падставай з'яўляецца традыцыйная для тамісцкай плыні праблема ўзаемадзеяння ісцін аб'яўлення і розуму, а сама тэорыя пазнання неатамізму мае падмуркам канцэпцыю гармоніі дзвюх ісцін. Фама Аквінскі, распрацоўваючы ўласную філасофскую дактрыну, адзначыў магчымасць выкарыстання верай розуму ў якасці сваёй натуральнай падставы. Мэта чалавечага розуму, паводле яго, заключаецца ў рацыянальным абгрунтаванні веры. У трансфармаваным варыянце ў выніку асноўны змест дадзенай канцэпцыі ў плыні неатамізму складаюць наступныя палажэнні: аўтэнтычны прынцып гармоніі дзвюх ісцін, фідэістычная версія прыродазнаўчых тэорый, выкарыстанне "прынцыпу аналогіі" ў гнасеалогіі, песімістычная ацэнка сцыентызму і сацыяльных вынікаў навукова-тэхнічнага прагрэсу, вучэнне аб анталагічных і гнасеалагічных ісцінах. Вынік працэсу пазнання фарміруецца на падставе дадзеных з двух крыніц – дадзеных розуму і дадзеных аб'яўлення.

Спецыфіка беларускай рэлігійна-філасофскай думкі каталіцкага накірунку ў ХХ ст. заключаецца ў тым, што ў ёй амаль цалкам адсутнічае рэфлексія, асноўным прадметам якой з'яўляецца канцэпт пазнання і звязаныя з ім праэдыкаты, затое вялікае месца займае менавіта пытанне адносін веры і розуму, карэляцыі ісцін аб'яўлення і розуму. Таксама беларускімі аўтарамі шырока выкарыстоўваецца запазычаная ў тамістаў іерархічная класіфікацыя навук.

**Асноўная частка**. Сярод беларускіх прадстаўнікоў неатамізму, рэфлексія якіх закранае гнасеалагічную праблематыку, трэба адзначыць Фабіяна Абрантовіча, Адама Станкевіча, Яна Тарасевіча, Льва Гарошку, Тамаша Падзяву і Чэслава Сіповіча. Разам з тым, адзіны аўтар, у творах якога сустракаецца аналіз самаго азначэння пазнання – Фабіян Абрантовіч. У межах філасофска-тэалагічных трактатаў "Касцёл і навука", "Чалавек" ён падрабязна разглядае дадзенае паняцце, вылучаючы яго асноўныя рысы. На думку Ф. Абрантовіча, у падмурку працэсу пазнання знаходзяцца метады аналізу і класіфікацыі: "Пазнанне – гэта сцвярджэнне якой-небудзь рэчаіснасці. Сцвярджаючы рэчаіснасць, успрымаем рэчы аднолькава і розна і затым укладаем іх паводле гэтага падабенства або розніцы ў групы, або, інакш кажучы, класіфікуем. Разкласіфікаваўшы, сцвярджаем залежнасць аднаго элементу рэчаіснасці ад другога – або прычыннасць, далей шукаем прычыны, якія кіруюць з'явамі рэчаіснасці і ёю самой" [10, с. 5].

Зыходзячы з фідэістычных пазіцый аўтар вылучае чатыры віды пазнання: звычайнае, навуковае, філасофскае і веру. Пры гэтым Ф. Абрантовіч адзначае, што ў адносінах да апошняй гаворка не ідзе аб нейкім рэлігійным феномене, вера – гэта прыняцце фактаў без пацвярджэння іх уласным вопытам і праверкай. Аўтарам падкрэсліваецца, што дадзены від пазнання выступае значна часцей, чым навуковае ці філасофскае пазнанне [9, с. 12–13]. У далейшым мысліцель выкарыстоўвае дадзенае сцвярджэнне дзеля далейшага абгрунтавання тамістычнай канцэпцыі веры і розуму, бачачы неабходнасць апалагетычнай падтрымкі самаго канцэпту веры.

Яшчэ адзін аўтар, які ў сваёй працы ўскосна закранае пытанні, звязаныя з аналізам працэсу пазнання, – Я. Тарасевіч. У трактаце "Беларусы ў святле праўды" ён адзначае, што пазнанне ўласціва толькі людзям, а яго галоўнымі рысамі з'яўляюцца магчымасць "адарвацца ад таго, што карысна толькі для плоці", а таксама здольнасць да класіфікацыі, устанаўлення сувязі паміж прычынай і вынікам [13, с. 7]. Трэба адзначыць, што дадзены ўрывак яскрава сведчыць і пра парэшткі аўгусцініянскай традыцыі ў рэфлексіі аўтара.

Пераходзячы непасрэдна да аналізу праблемы рэцэпцыі ідэй неатамізму ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы, трэба адзначыць, што першы тэзіс, на які абапіраюцца неатамісты, у тым ліку і беларускія, у гнасеалагічным аспекце – гэта магчымасць выкарыстання розуму ў якасці натуральнай апоры веры. Фама Аквінскі падрабязна разглядае дадзенае пытанне на старонках “Сумы супраць паганцаў” [7, с. 35–53]. Трэба адзначыць, што дадзенае палажэнне з’яўлялася асноватворным для прадстаўнікоў беларускай рэлігійна-філасофскай думкі XX ст. з той толькі розніцай, што канцэпты “ісціны веры” і “ісціны розуму” выкарыстоўваюцца тут пад іншымі назвамі.

Першы да пытання азначэння ісцін аб’яўлення і розуму ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы XX ст. звяртаецца Фабіян Абрантовіч, абсалютна ў тамісцкім рэчышчы, адзначаючы адзіную крыніцу, характэрную для абодвух канцэптаў, але розныя вобласці іх выкарыстання: “Апіраючыся на вопыт, г.зн. на сцвярджэнні таго што ёсць, адзначылі ўжо, што прызнанне належных правоў за розумам ёсць падставай для ведаў пра веру. Таксама, паводле Касцёла, Аб’яўленне ня пярэчыць навуцы, але знаходзіцца па-над ім. Не такім чынам, быццам розум яго дасягнуць ня мог, але так, што пазнанне асноваў Аб’яўлення мае сваю крыніцу ў розуме, у вопыце” [10, с. 8].

У якасці найбольш яскравага прыкладу рэфлексіі над паняццем ісціны можа быць названа праца Я. Тарасевіча “Беларусы ў святле праўды”, на старонках якой чытач неаднаразова сутыкаецца з пазначанымі вышэй канцэптамі. Я. Тарасевіч класіфікуе паняцце ісціны, вылучаючы ў ім некалькі аспектаў. Гэта дае аўтару права выкарыстоўваць у трактаце такія віды ісціны, як лагічная, анталагічная і ісціна веры. Паняцце анталагічнай ісціны мае падставай канцэпцыю памяркоўнага рэалізму. Дэталізуючы пазначаны канцэпт, Я. Тарасевіч звяртаецца да прыкладу ўзора малюнку ў розуме мастака і адпаведнасці атрыманага выніку на карціне, адзначаючы, што калі на месца мастака паставіць Абсалют, а на месца карціны – створаны свет, то адпаведнасць паміж першым і другім і будзе называцца ісцінай анталагічнай: “Ад мастака-маляра звярнемся да мастака Стварыцеля, да Бога. Бог ёсць усямудрым і Усёмагутным мастаком свету. Гэта значыць, што ў ягоным розуме быў адвякоў вечных ўзор свету, усіх рэчаў, істот у свеце: сонца, зорак, планет, расцін, жывёлаў, асабліва чалавека, што сваім усёмагутным словам ён стварыў з нічога свет паводле вечнага узору. Дык звярнуць гэтую увагу трэба нам на дзве рэчы: на свет адвякоў вечных або на ўзор свету ў розуме Божым, і на свет ад пачатку свайго існавання паза сваім узорам або на абраз таго ўзору. А цяпер згоднасць гэтага абразу са сваім узорам і ёсць праўдай, якую называюць філосафы, праўдай анталагічнай” [13, с. 13–14].

Наступным відам ісціны, паводле Я. Тарасевіча, з’яўляецца ісціна лагічная, якая ўжо будуецца паводле сувязі “рэч – розум чалавека”. Аўтар адзначае: “Розніца: ў свеце онтологічным розум ёсць прычынай праўды: з Божага розуму, напрыклад, увесь свет праўд анталагічных выплыў. У свеце-ж лагічным дзеецца наадварот: рэч ёсць прычынай праўды ў нашым розуме. Дзеля гэтага праўда анталагічная ёсць фундаментам праўды лагічнай: бяз першай ня можа быць другой”.

Такім чынам, на падставе разважанняў Я. Тарасевіча можна зрабіць наступныя высновы: для аўтара пад назвамі ісціны анталагічнай і ісціны лагічнай выступаюць тамістычныя ісціны розуму і ісціны веры. Адзначаецца залежнасць першых ад другіх, што таксама цалкам упісваецца ў канцэпцыю дваістай ісціны Фамы Аквінскага. Цікава адзначыць, што само паняцце мовы ў Я. Тарасевіча як увасаблення ісцін лагічных мае ў падмурку т.зв. “анталагічны падыход”, заснаваны на тэзісе аб прэзумпцыі анталагічнай заданасці адпаведнасці назвы і рэчы: “Калі наша мова сапраўды ёсць выражэннем нашых ідэалаў, паняццяў у розуме, дык маемо праўду логічную” [13, с. 17]. Анталагічны падыход у больш шырокім аспекце звязаны з філасофіей імя, а таксама з традыцыйнай парадыгмай мовы, з’яўляецца яскравым сведчаннем прыналежнасці аўтара да кірунку памяркоўнага рэалізму, які сягае каранямі ў вядомую спрэчку аб універсаліях.

У далейшым Я. Тарасевіч надае сваёй гнасеалагічнай канцэпцыі этычную афарбоўку, адзначаючы, што акрамя ісцін анталагічных, лагічных існуюць яшчэ і ісціны маральныя. Ён адзначае, што мае на ўвазе пад гэтым паняццем адпаведнасць думак словам і ідэям [13, с.17]. Адной з галоўных уласцівасцяў канцэпцыі Я. Тарасевіча з’яўляецца яе іерархічнаць: галоўнае месца тут займае анталагічная ісціна, якой падначалена ісціна лагічная; ёй у сваю чаргу падпарадкоўваецца ісціна маральная [13, с.18]. Асобна аўтарам вылучаецца ісціна веры, якая атаясамляецца з адбіткам у розуме чалавека ісціны надпрыроднай [13, с.19] і з’яўляецца на самой справе аналагам ужо ўзгаданай вышэй ісціны аб’яўлення Фамы Аквінскага.

Канцэпцыя дваістай ісціны, суаднесення ісцін аб’яўлення і ісцін розуму набывае ў творчасці беларускіх прадстаўнікоў неатамізму відавочна апалагетычны характар. Аўтары звяртаюцца да дадзенай праблематыкі, каб даказаць, што, у згоднасці з дактрынай тамізму, праўды розуму ў выпадку канфлікту, павінны падначальвацца ісцінам аб’яўлення. У якасці прыкладу можна звярнуцца да творчасці Л. Гарошкі, вядомага ў айчыннай філасофска-рэлігійнай думцы шматлікімі даследаваннямі на тэму суадносін паміж навукай і рэлігіяй: “Калі людзкі зор бачыць толькі невялікую паверхню зямнога глёбу, дык магчыма, што ў шмат меншай ступені людзкі розум бачыць Боскасць у Божым Аб’яўленні, аднак каб зразумець Бога нават у тым абсягу, у якім Ён сябе аб’явіў, трэба мець Божы розум, значыць трэба

быць самім Богам. Таму нічога дзіўнага, што для чалавека некаторыя аб'яўленыя праўды і далей застаюцца тайнамі. Яны папросту перавышаюць наш розум. Калі сцвярджаем гэта, дык не адмаўляемся ад свайго розуму, наадварот, калі прынамсі гэтую праўду ўцямім як сьлед, дык ужо розум выканае вялікую працу" [2, с. 2].

Вышэйпазначаны ў творчасці Я. Тарасевіча кірунак памяркоўнага рэалізму прысутнічае ў рэфлексіі не толькі Л. Гарошкі, але і Ч. Сіповіча. Абодва аўтары сцвярджаюць рэальнае існаванне агульных паняццяў. Ч. Сіповіч адзначае: "У хрысьціянскім сьветапоглядзе трэба разрозьніць тры сферы: рэчаіснасьць духовае сферы, як: Бог, анёл, душа; рэчаіснасьць матэрыяльнае сферы, існуючае навокал нас і рэчаіснасьць ідэяў, або паняцьцяў, што ёсьць у нас быццам адбіты ў люстры вобразы і яны адказваюць праўдам, рэальна існуючым вакол нас. Тое да чаго мы даходзім праз нашыя паняцці, суды і сказы – гэта ня ёсьць нейкая фікцыя, або толькі адбіцьцем рэчаіснасьці, але так-жа рэчаіснасьцю, якая аб'ектыўна існуе навокал нас. Таму навуковыя дасягненьні, маральныя прынцыпы, рэлігійныя праўды – гэта ня выдумка нашага "Я", але аб'ектыўна існуючыя праўды, ад прызнаньня якіх узалежнена якасьць нашага жыцьця" [5, с. 7]. Л. Гарошка таксама падтрымлівае дадзеную пазіцыю: "Міма таго, што нашы думкі і нашы ідэі launch нематэрыяльныя ў іх рэальнасьці ніхто ня сумняецца. Бесьпярэчна так-жа што яны астаюцца негдзе ў нас, але так-жа бесьпярэчна, што яны ня маюць ніякай матэрыяльнасьці" [1, с. 2].

У межах тамістычнай дыскусіі, прысвечанай ісцінам аб'яўлення і ісцінам розуму, у беларускай рэлігійна-філасофскай думцы набірае папулярнасць праблема класіфікацыі навук, асноўным цэнтрам якой становяцца іерархічныя сувязі непасрэдна навукі ў яе пазітывісцкім разуменні, філасофіі і тэалогіі. Прычым філасофія ў сваім змесце часта супадае з тэалогіяй. Сярод прадстаўнікоў рэлігійна-філасофскай традыцыі гэта даволі распаўсюджаная справа, пра што ўзгадвае ў сваім эсэ "Філосаф і тэалогія" адзін з найбольш выдатных неатамістычных філасофаў XX ст. – Эцьен Жыльсон.

Узгадкі аб іерархічнай класіфікацыі навук – звычайны феномен ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы каталіцкага напрамку. Так, напрыклад, дадзены аспект узгадваецца ў Ф. Абрантовіча ў працы "Касцёл і навука", дзе паміж іншым ён адзначае, што эмпірычныя навукі даследуюць знешнія прычыны рэчаў, філасофія даследуе ўнутраныя, а тэалогія займаецца даследаваннем звышнатуральнай рэчаіснасці [9, с. 8]. Іншую трактоўку прапануе А. Станкевіч, у рэфлексіі якога вывучэнне знешніх прычын – гэта прадмет непасрэдна філасофіі, у той час як унутраныя можна зразумець толькі з дапамогай рэлігіі [12, с. 3]. Трэба адзначыць, што пазіцыя А. Станкевіча ўяўляе сабой крайні фідэістычны варыянт у шэрагу канцэпцый іерархічнай класіфікацыі навук у параўнанні з варыянтам Ф. Абрантовіча.

У духу неатамістычнай дактрыны выказваюцца беларускія аўтары і адзначаючы першасную фундзіраванасць хрысціянства грэчаскай філасофіяй. Дадзены тэзіс, некалькі разоў артыкуляваны ў знакамітай энцыкліцы "Aeterni Patris", папулярызуецца ў шматлікіх працах беларускіх аўтараў. Так, напрыклад, Язэп Рэшаць у сваім вядомым артыкулы "Апалагетыка ў адносінах дзяржавы рымскай да хрысціянства" адзначае, што старажытнагрэчаская філасофія была неабходным этапам, які падрыхтаваў свядомасць грамадства да прыняцця хрысціянскіх каштоўнасцяў [11, с. 2], а Я. Тарасевіч сцвярджае, што грэчаская філасофія, якая ў шматлікіх беларускіх мысліцеляў атаясамлівалася менавіта з ісцінамі розуму, была папярэдніцай хрысціянства. Адной з галоўных мэт яе з'яўлення сцвярджалася выхаванне рэлігійнасці, на ўдзячнай глебе якой потым расквітнелі хрысціянскія каштоўнасці [14, с. 2].

Яшчэ адно яскравае сведчанне прысутнасці тамістычных праграмных установак у беларускай рэлігійна-філасофскай думцы – наяўнасць перманентных зваротаў да рацыянальных доказаў існавання Абсалюту Фамы Аквінскага. Дадзеная тэма праходзіць праз творы амаль усіх прадстаўнікоў беларускай каталіцкай традыцыі. Так у якасці прыкладу трэба ўзгадаць вядомую паэму Тамаша Падзявы "Дзем'ян або як людзі пачалі верыць у Бога", якая паводле азначэння самаго аўтара, створаная менавіта з мэтай папулярызацыі пятага доказу існавання Абсалюта Фамы Аквінскага [4, с.105].

Таксама адным з яскравых сведчанняў гэтага з'яўляюцца наступныя радкі, якія належаць невядомаму аўтару: "Для доказу існавання Бога ня ёсьць вырашаючым век сусьвету, але тое, якая была першапрычына яго існавання: ці сусьвет ёсьць бытам самаістным самавыстарчальным, г.зн. мае прычыну свайго існавання ў сабе самым, ці канечне вымагае іншай, вышэйшай за сябе, прычыны існавання? Каліб меў сам ў сабе прычыну тую, дык ёю не магло б быць што іншае, толькі "матэрыя" із сваёю сілай: тады матэрыялізм быў бы логічны, бо ж ведама, што арганічнае жыццё, жывёльнае, а навет жыццё духовае чалавека мелі свой пачатак на гэтым свеце ў сваячаснай адноснай эпохы яго развіцця. Але-ж было б усё тое, што мае свой пачатак, ня можа быць прычынай усяго істнуючага, але мусіць мець прычыну свайго існавання аднекуль інакш. Калі, напрыклад, перад паўстаннем жыцця на свеце існавала толькі матэрыя, дык яна павінна быць першапрычынай усяго і станавіла б – як кажуць філозафы – быт абсалютны. У такім выпадку ў гэтай матэрыі былаб і тая жыцядайная сіла для жывых істотаў з іхнімі дзівугоднымі якасьцямі, феноменамі ўспрыймання, пачуцця, думання і хацення. Каліж насуперак – нельга ўсяго гэтага аб'ясніць без інтэрвенцыі сілы духовай творчай, прызнаць духовую першапрычыну, субстанцыяльна розную ад сусьвету чыста матэрыяльнага, а знача і вышэйшую ад яго. Гэны духовы быт, вышэйшы ад свету, гэну абсалютную самавычтарчальную самаісную першапрычыну ўсягочыста, называем Богам" [3, с. 2–3].

Адна з найбольш характэрных рысаў неатамізму, якая адрознівае яго ад папярэдніх этапаў развіцця тамістычнай думкі – сцыентыназаванасць. Дадзеная тэндэнцыя таксама выразна прасочваецца ў творчасці беларускіх прадстаўнікоў неатамізму. Так, напрыклад, А. Станкевіч у сваіх прамовах спрабуе даказаць канечнасць матэрыяльнага свету, разглядаючы ў якасці падставы сваёй рэфлексіі канцэпцыю энтрапіі: "Сьвет і ўсё ў ім існуе дзякуючы таму, што адбываюцца ў ім фізычныя і хімічныя зьмены, што ёсьць сьвятло, рух, жыцьцё, прасьцей кажучы, дзякуючы таму, што дзеіць у сьвеце энэргія, сіла. З прычыны гэтага дзеяньня колькасьць энэргіі астаецца нязьменнай, але зьмяншаюцца яе якасьці. Гэта знача, што ўнутраная энэргія кожнага цела, споўніўшы сваё заданьне, становіцца няздатнай да далейшага руху, да дзеяньня. Гэтую праяву на сьвеце вучоныя назвалі з грэцкага правам энтрапіі і на падставе гэтага права даказваюць, што мусіць прыйсьці скончэньне ўсяго сьвету, бо мусіць на сьвеце агульная энтрапія (у дзеяньні Сонца, у руху, у цяпле), а зь ёй і канец сьвету, зьніштажэньне, сьмерць яго" [6, с. 649–650]. Таксама спрабуе даказаць наяўнасць Абсалюту спасылкамі на апошнія навуковыя адкрыцці і Ф. Абрантовіч, адзначаючы, што ўздзеянне Бога трэба шукаць у адказах на наступныя пытанні: што ёсць энергія, адкуль пайшоў першы рух, у чым крыніца паходжання матэрыі і г.д. [8, с. 14–18]. Дзеля абгрунтавання зноў выкарыстоўваюцца рацыянальныя доказы існавання Абсалюту.

**Заключэнне**. Такім чынам, вышэй адзначанае дае магчымасць сцвярджаць, што гнасеалагічны аспект беларускай рэлігійна-філасофскай думкі ў ХХ ст. знаходзіўся пад моцным уплывам неатамістычнай філасофскай плыні, ён запазычыў яе асноўныя канцэпты і праграмныя ўстаноўкі, а таксама быў неатамістычным па сваёй сутнасці. Адлюстравалася гэта ў першую чаргу ў звароце да канцэпцыі ісцін аб'яўлення і ісцін розуму, погляду на розум як на натуральную апору веры, а таксама ў выкарыстанні іерархічнай класіфікацыі навук і шырокім распаўсюджванні рацыянальных доказаў існавання Абсалюту. У адносінах да праблемы ўніверсалій накірунак беларускай рэлігійна-філасофскай думкі трэба аднесці да плыні памяркоўнага рэалізму, таксама характэрнага для неатамістычнай традыцыі.

Разам з тым трэба адзначыць, што па-за межамі ўвагі беларускіх мысляроў амаль цалкам засталіся праблемы самаго азначэння канцэпту пазнання і звязаных з ім працэсаў. Да дадзенай праблематыкі звярталіся толькі Ф. Абрантовіч і Я. Тарасевіч, прычым у апошняга відавочна схільнасць і да аўгусцініянскай традыцыі.

ЛІТАРАТУРА


1. Гарошка, Л. Дух часу / Л. Гарошка // Божым шляхам. – 1954. – № 60. – С. 1–2.
2. Гарошка, Л. Тайны веры і розум / Л. Гарошка // Божым шляхам. – 1949. – № 3. – С. 2–4.
3. «Нашто рэлігія» адно пытаньне вырашальнага значэньня // Божым шляхам. – 1953. – № 56. – С. 2–3.
4. Подзява, Ф. Демьян, или Как люди стали верить в Бога / Ф. Подзява. – Полоцк, 2003. – 111 с.
5. Сіповіч, Ч. Часы Хрыста і нашыя / Ч. Сіповіч // Божым шляхам. – 1948. – № 11–12. – С. 4–7.
6. Станкевіч, А. Божае Слова: Эвангэліі і прамовы на нядзелі і сьвяты / А. Станкевіч // З Богам да Беларусі : зб. твораў. – Вільня : Ін-т Беларусістыкі, 2008. – С. 575–719.
7. Аквинский, Фома . Сумма против язычников. Кн. 1 / Фома Аквинский. – М. : Ин-т философии, теологии и истории св. Фомы, 2004. – 439 с.
8. Abrantowič, F. Boh. / F. Abrantowić. – Wilno, 1928. – 25 s.
9. Abrantowič, F. Čalawiek. Filasoŭska-tealahičny narys / F. Abrantowić. – Wilno, 1929. – 16 s.
10. Abrantowicz, F. Kasciol a nawuka / F. Abrantowicz. – Wilno, 1912. – 32 s.
11. Rešać, J. Apalahietyka ŭ adnosinach dziaržavy rymskaj da chryscijanstva / J. Rešać // Chryścijanskaja Dumka. – 1928. – № 16. – S. 2–4.
12. Stankievič, A. Božaje slova na VI niadzielu pa Siomusie / A. Stankievič // Chryścijanskaja Dumka. – 1935. – № 7. – S. 2–3.
13. Tarasievič, J. Bielarusy ŭ sviatlie praŭdy / J. Tarasievič. – Viĺnia, 1935. – 30 s.
14. Tarasievič, J. Čałaviek – šukannik Boha / J. Tarasievič // Chryścijanskaja Dumka. – 1933. – № 1. – S. 2–7.


*Поступила 05.10.2015*

## NEOTHOMISTIC ASPECT IN THE EPISTEMOLOGICAL PROBLEMATIC OF BELARUSIAN RELIGIOUS AND PHILOSOPHICAL THOUGHT IN XX ct.

***H. KLIMOVICH***

*The main theme of this article is phenomenon of reception the neo-thomistic concepts in the epistemological aspect of Belarusian religious and philosophical thought in XX ct. Epistemological problematic was one of the most significant throughout all stages thomistic thought development. It continues to be one of the most important in the works of neothomists. The article answers next questions: what concepts have impacted on the formation of Belarusian religious and philosophical thought in XX ct., what particular features were created during the process of reception and the main – can be Belarusian religious and philosophical thought be named neothomistic in its epistemological essence.*